**Міхно, У.** Толькі ў палёце жыве чалавек / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2007. — 11 верас. — С. 3.

## ТОЛЬКІ Ў ПАЛЁЦЕ ЖЫВЕ ЧАЛАВЕК



Ён памяркоўны, удумлівы, спакойны. Можна было б нават падумаць, што ён флегматык, калі б не ведаў, што суразмоўца – лётчык першага класа, лётчык сапраўды баявы. У яго, Івана Яўгенавіча Садоўскага, у паслужным спіску – дванаццаць баявых вылетаў у Афганістан. А ўсяго гэты чалавек правёў за штурвалам самалёта 1750 гадзін. Нездарма кажуць, што толькі ў палёце жыве чалавек.

Збылася крылатая юначая мара вясковага хлопчыка з лясной аддаленай Велеўшчыны, што на Лепельшчыне. Збылася мара – лятаць! А падштурхнуў да яе школьны сябар, з якім разам вырашылі паступаць у вышэйшае авіяцыйнае вучылішча. Сябар нават не прайшоў медкамісіі, а ён, Іван, з другой спробы і насуперак волі бацькоў, для якіх прафесія лётчыка была проста нечым недасяжным, нерэальным, а таму непрактычным, паступіў у Харкаў. І, правучыўшыся больш як чатыры гады па спецыяльнасці і тактычная знішчальная авіяцыя, быў адпраўлены ў групу савецкіх войскаў у Германію. Ёсць такія ў Германіі гарадкі Віштак і Фіноў. Там ён цягам пяці гадоў лятаў спачатку на лёгкім знішчальніку «МИГ-21», а затым на «МИГ-23». Гэта было ў 1976–1981 гадах. А потым у складзе звяна быў перакінуты ў Туркестанскую ваенную акругу. Што гэта азначала, зразумела кожнаму. Ішла вайна ў Афганістане. Там патрабавалася сур’ёзная падтрымка авіяцыі. Школу Афганістана прайшлі ў той час большасць афіцэраў лётнага складу, у тым ліку і ўжо вопытны на той час лётчык Іван Садоўскі. Іван Яўгенавіч успамінае тыя суровыя ваенныя будні спакойна, быццам бы адбывалася нешта звычайнае. На самой жа справе кожны з яго дванаццаці баявых вылетаў быў гульнёю са смерцю, бо яна магла падпільнаваць на любым кіламетры.

Асабліва складана было пасадзіць самалёт. Зніжаліся рэзка з вялікай вышыні. Гэта называлася пасадкаю як бы са спыненым рухавіком. Як не дзіўна, менавіта такое рэзкае зніжэнне ў баявых умовах давала гарантыю найбольшае бяспекі; бо знішчыць самалёт з зямлі маглі ў любы час.

Вось табе і флегматык! Уявіце сабе, каб «адпрацаваць» па наземных цэлях, трэба было з вышыні паўтары тысячы кіламетраў імкліва знізіцца да 250 метраў і на «бреющем полете» расстрэльваць ворага. І ўсё роўна расстрэльваеш, бадай, усляпую, дзе ты з вышыні ўбачыш кожнага ў гарах і ў зялёных лясных масівах. Асабліва запомніўся першы баявы вылет у Кандагар. Магчыма, таму што ён быў першым.

Што галоўнае для лётчыка? Іван Яўгенавіч, не задумваючыся, адказвае: рэакцыя. Што для чалавека «зямной» прафесіі даравальна, тое для камандзіра «паветранага судна» – смерць.

Абышлося. Афганская баталія закончылася для Івана Садоўскага шчасліва. Як у той песні: «Куля забаялася, штык не ўзяў». З Афганістана прывёз медаль «За баявыя заслугі». А баявыя ўзнагароды так проста не даюць. Маючы за плячыма 33 гады агульнага стажу (часта год ішоў за два), маёр Іван Садоўскі звальняецца ў запас у лістападзе 1991. А праз колькі месяцаў рухнула краіна, якая дала яму крылы, увасобіўшы ў рэальнасць светлую юначую мару.

Зараз Іван Яўгенавіч працуе вядучым інжынерам 2 аддзела Лукомльскай ДРЭС. На гэтай станцыі, дарэчы, працаваў і яго бацька. Дарослая дачка, падрастае ўнучка Валерыя. Прывык ваенны лётчык да зямных будняў. Але неба з яго завоблачнымі далямі па-ранейшаму хвалюе, па-ранейшаму вабіць і кліча.

**У. Міхно**